Другі фронт мастацтваў

Вера Бурлак
Віктар Жыбуль

# ЗАБІ Ў САБЕ САКРАТА!

Вершы

Мінск
"Галіяфы"
2008

www.kamunikat.org

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Б91

Серыя заснавана ў 2000 годзе

Кніга сямейнай пары ўлапішыстаў Віктара Жыбуля і Веры Бурлак – для тых, хто хоча знітаваць сваё жыццё з паэзіяй. Вершы з яе можна завучваць на памяць, дэкламаваць пад музыку, выкарыстоўваць у побыце дарэчы і недарэчы, прамаўляць за святочным сталом, мармытаць у душы, шаптаць, каб заснуць, і выгукаць, каб прачнуцца... Урэшце, іх можна проста чытаць, паслядоўна перагортваючы старонкі. Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6906-02-5**

© Бурлак В.Ю., Жыбуль В.В., 2008
© Афармленне. ПУВП “Галіяфы”, 2008

www.kamunikat.org

## МАНІХВЭСТ

Мастацтва патрабуе -
ахвяраў не хапае.
Хто возьме, пасправбуе -
з насоў накалупае
такога матэр'ялу,
зь якога лепяць цуды:
антычныя піялы,
гатычныя спаруды?



www.kamunikat.org

Тады свабоды сьвята
сьвятлом сагрэе нас.
Мастацтва ўедзе ў хату,
мастацтва дзеля мас-
тацтва дзеля дзіва
злавеснай пекнаты -
мастацкія масівы,
мастацкія масты!

www.kamunikat.org

# КУШЭТКА-ГРЫЛЬ



www.kamunikat.org

* * *

На правадох электрык павіс.
Тырчыць адвёртка з ілба.
І думаеш, бачачы гэты эскіз:
“Наша жыцьцё - барацьба!”



www.kamunikat.org

## ШАХЦЁРАМ

Колькі пранікнёных палкіх фраз,
поўных суму, роспачы ды болю
я кажу, калі зьядаю ўраз
лыжку роднай беларускай солі!

* * *

Няма вушэй у птушак.
Адрэзаць вушы.
Павыдзіраць сабе ўсе зубы,
Завострыць нос і губы,
Разрэзаць рукі ўздоўж па
локаць,
Наторкаць пёраў,
Зрабіцца самай лёгкай.
Я больш ня буду ежу лопаць,
Я буду лётаць.



www.kamunikat.org

## ЛАГОДНЫ ТРАВЕНЬ

Я зноў хачу, як у дзіцячай пары,
хадзіць па столі нагамі да гары,
дражніць сьмерць, за касу цягаць,
і на самакацеры пацеры па мацеры.
Але са столі вапну зьдзёрлі галубам,
а самакат закатаваўся сам,
і сьмерць, нібы з вады за валасы,
з жыцьця рукамі цягне. Без касы.



www.kamunikat.org

* * *

Феина дочь утонула в росинке.
В. Набоков.

Феі, эльфы і русалкі
топяць нежаданых дзяцей у расе,
бо на гэтай зямлі ўсе так робяць,
і яны – як усе.



www.kamunikat.org

* * *

На чырвонае сьвятло
пайшоў
дождж

www.kamunikat.org

## ПРЫГАЖУНЯ ЙШЛА ЎМІРАЦЬ

Прыгажуня йшла ўміраць
І пыталася ў ката:
Ці будзе мне пасаваць
З галавою адцятай?

Ці будуць дзяўчаты зайздросьціць
Майму целу ў крывавай сукенцы?
Ці будзе сьляпіць прыгажосьць
Тых, хто там глядзіць у акенцы?



www.kamunikat.org

І ёй адказваў кат:
Будзе, будзе ўсё, не турбуйся.
Інакш бы я цябе ўратаваў,
Каханая мая прыгажуня.



www.kamunikat.org

* * *

Я працягнуў руку дапамогі,
а мне ў адказ працягнулі ногі.

* * *

Трамвай спыніўся на павароце.
Павыбівала ўсе зубы ў роце.



www.kamunikat.org

* * *

Бэзавыя джунглі,
Дубовыя лугі.
Пяцёра сіганулі,
Зламалі тры нагі.

Тут мурашы-пачвары.
Навошта нам сафары!

## ЦЯЖКІ ВЫПАДАК

Аднойчы мне здалося,
што ад мяне нічога не
засталося.
І не было ў каго запытацца:
"А што ж ад мяне павінна
застацца?"



www.kamunikat.org

## ТРЫЯЛЕТ

Лізэта - цуд у гэтым сьвеце.
А ў тым - ня цуд. А ў тым -
шкілет.
Але навошта нам той сьвет?
Лізэта - цуд у гэтым сьвеце.

Бяжы ж хутчэй: цябе
прывеціць
І твой ухваліць трыялет
Лізэта-цуд у гэтым сьвеце,
А ў тым - ня цуд. А ў тым -
шкілет.



www.kamunikat.org

* * *

Выйшаў чалавек глухі
На трамвайныя шляхі.
- Дзінь-дзінь-дзінь! - сказаў трамвай
І адвёз глухога ў рай.

* * *

Учора ці пазаўчора -
ня памятаю ўжо, калі -
мне здаўся халодным мой горад.
Я ўзяў - і яго спаліў.
У гурбах ягонага попелу
цяпер мне ўтульна й цёпла.



www.kamunikat.org

* * *

Запусьцілі мы ракету.
Быў Сусьвет - няма
Сусьвету...

## КІМ БЫЦЬ

- Кім ты хочаш быць, калі
вырасьцеш? -
Спыталі ў маленькага Толі.
- Я ніколі ня вырасту.
У нас занізкія столі.



www.kamunikat.org

## ЛЕТАПІСНАЕ

Я чакаю. Мяне папярэдзілі.
Я цалую знутры тваю скронь.
Ты навокал мяне, я ў сярэдзіне.
Я – зьмяя ў тваім чэрапе, конь.

* * *

Недастварыўшы перла,
Жамчужніца памерла.



www.kamunikat.org

# КАПІТАН ЖУЄ



www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

## ВОЖЫКІ

Супынілі вожыкі
рух сваёй хады.
Захацелі вожыкі
вогненнай вады.
Вогненныя вожыкі
выпілі ваду.
І цяпер у вожыкаў
вогненны бадун.



www.kamunikat.org

## СПРЭЧКА

Закрычаў капітал сусьветны: - Пі-і-і-і!
Прачынайся ды йдзі на працу!
А працоўны народ супакоіў: - Сьпі.
Быў бы сэнс дзеля іх старацца.

Капітал сусьветны сваё: - Працуй!
Гэта твой сьвяты абавязак!
А працоўны народ: - Замаўчы, буржуй,
Досыць нам сацыяльных казак!



www.kamunikat.org

Учапіліся ў кудзеры і па скон
Іх дзяруць за сьвятую мэту:
- Абуджэньне душы сусьвету!
- Не, за ейны спакойны сон!

www.kamunikat.org

* * *

У мяне зачасалася сьпіна -
на ёй завялася вош.
Я гэта так не пакіну.
Калі ня я, дык хто ж?

Бывае, пасьля куфлю піва
дрэва шукаць ідзеш -
так хочаш зрабіцца шчасьлівым.
Калі ня тут, дык дзе ж?



www.kamunikat.org

## ПРАЛЯТАЛІ ПТУШКІ

Праляталі птушкі
Над зялёным лугам
Паскідалі птушкі
На зямельку яйкі
На патэльні луга
Бела-залатыя
Смажацца яешні -
Белыя рамонкі.



www.kamunikat.org

## ЭРДЭЛЬТЭР’ЕР

I

Я краў дабро чужых кватэр.
Мяне кусаў эрдэльтэр’ер.

II

На поле выпала раса.
Эрдэльтэр’ер мяне кусаў.

III

На срэбратканым дыване
эрдэльтэр’ер кусаў мяне.



www.kamunikat.org

* * *

Сьвет – тэатар. Людзі ў сьвеце
Хто актор, а хто глядач,
Хто буфетчык у буфеце,
Хто вахцёр, а хто – прабач...
Хто прымае ў гардэробе
Курткі, шапкі, паліто,
Хто цукерачка ў вантробе,
Хто – наогул абы-хто.

## ЧАПЛЕЛАСІ

Чапля да лася
чаплялася,
чаплялася -
і аддалася.
І ў чаплі павылупляліся
маленькія чапleласі -

крылатыя, рагатыя,
зь дзюбамі й капытамі.
А потым за чапляй ганялася
з чапялою ласіха.
І галасіла, галасіла,
пакуль у лесе
не зрабілася ціха.



www.kamunikat.org

* * *

Маё сэрца стукоча, як
швальная машынка –
Няўдалае дзіця фірмы
“Атрапас” –
Якая толькі й ведае, што
рваць ніткі.
Ёй бы рабіць лапшу.

## ЧАМУ Я ВЭГЕТАРЫЯНЕЦ

Я С А М
М Я С А



www.kamunikat.org

## ТРЫЯЛЕТ-БРАХІКАЛЯН

Са-
Ла,
Мя-
Са

Я
Ку-
Са-
Ла.



www.kamunikat.org

## ТУЮГ БАГЕМНЫ

Не кахала Пія Ніна,
хоць той граў на піяніна.
Пій паіў Яніну з гора:
- Пі, Яніна!.. Пі, Яніна!..

## ТУЮГ ЗАСТОЛЬНЫ

Давай нальем яшчэ віна!
На "херас"! І "сацыві" - на!
Калі нас знойдуць у канаве -
дык будзе ў тым чыя віна?



www.kamunikat.org

## ТУЮГ ЭКАЛЯГІЧНЫ

Каб не засохлі, мо, расьліны,
падліць ім трэба мора сьліны.
Ды дзе ж той сьліны столькі ўзяць,
калі навокал - мор асьліны?



www.kamunikat.org

* * *

Лыжнік сеў за піяніна.
“У рэшце рэшт адшукаў
вольны столік”, - з палёгкай
падумаў ён.

* * *

Хаты бяз дахаў
Шаты бяз птахаў
Ем без нажа
Хрэн без маржа

www.kamunikat.org

# НА ЛОЖКУ

## (Недакладныя рыфмы)

Я ляжу-сяджу на ложку,
Зьвесіўшы, гайдаю ножкай.
І таму я вельмі хутка
Застануся без абутку.



www.kamunikat.org

# КЛЮБ АМАТАРАЎ АДЗІНОТЫ



www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

## ЛЮБІ

Любіш катацца? - любі вазіць саначкі.
Любіш кахацца? - любі крывавыя плямачкі.
Любіш быць першым? - усіх астатніх забі.
Любіш чытаць вершы? - любі, любі...

www.kamunikat.org

## ПЛЯГІЯТ

Арцюр Рэмбо нацягнуў між дахаў вяроўкі,
Між зор нацягнуў жалезныя тросы,
Я прыйшла і скрала ўсё гэта.
І вось я танчу.



www.kamunikat.org

* * *

Дзеўка купіла вяроўку і мыла.
Раптам вяровачка загаманіла:
“Мыла - каб мыць,
а вяроўка - сушыць,
а не дзявочыя шыя душыць.
Мы - не для сьмерці, а для
чысьціні.
Лепей атруту ты праглыні!”

## ЭЛЕГІЯ № 1

Я зусім яшчэ маладая,
Але ўпала на галаву
І нікога больш не кахаю
І наогул больш не жыву.



www.kamunikat.org

* * *

Яны ад’язджалі па альфабэце
І па годзе нараджэньня.
Гэтыя пасьлядоўнасьці супадалі.
Апошнім зьехаў самы малодшы на “я”.



www.kamunikat.org

* * *

Мой голас лунае ў прыгожай магільні
У цемрадзі, што касуе час.
Вы можаце слухаць старанна і пільна,
Ды я ўсё адно не пачую вас.

* * *

Яна ведала, чым усё скончыцца.
Рамантычныя казачнікі пішуць ману.
Яна памылася, апранулася, заплюшчыла вочы
І паклалася ў труну.

І прыйшоў Голад. І прыйшла Смага.
Захацелася “Прымы”. Захацелася каньяку.
І прыйшлі дзеці: “Ма, табе блага?”
А муж усьміхнуўся і пацісну ў руку.



www.kamunikat.org

У яго за сьпінай даўно былі крылы,
З нагавіцы раз-пораз вызіраў белы край…
І яны жылі яшчэ доўга і міла,
І ён штоночы вадзіў яе ў рай.

www.kamunikat.org

* * *

Навошта мне маё жыцьцё бяз Слова,
Калі Яно і ёсьць маё жыцьцё?
Вазьмі жыцьцё. Пакінь мне толькі Слова.
Яго я буду мёртвая казаць.

* * *

Калі было мне тры гады -
я браў з налёту гарады.
А з тых часоў, як пасталеў,
ніяк не забаюю хлеў.



www.kamunikat.org

## НА МАСТАЦКАЙ ВЫСТАВЕ

Разьбягаюцца вочы -
я хутка зраблюся
касым.
Разьбягаюцца вочы -
баюся,
каб ня зьбеглі зусім.

* * *

на дне
дня
асадак
згадак



www.kamunikat.org

* * *

Ёсьць людзі блізкія,
а ёсьць і проста недалёкія.
Але найгорш -
калі два ў адным.

* * *

У цяжкім змаганьні зь лянотай
перамагло сяброўства.



www.kamunikat.org

* * *

Думаў: зараз прыляціць натхненьне,
а яно прыпёрлася на мыліцах.
Атрымаць хацеў задавальненьне,
а задавальненьня не атрымліваецца.

www.kamunikat.org

* * *

Рэчаіснасьць мне заткнула рот,
загадала тэрмінова ўніз ісьці
(А магло б жа здарыцца наадварот:
пайшоў бы ўверх,
сам заткнуў бы пашчу Рэчаіснасьці!)...



www.kamunikat.org

## АБ МЕСЦЫ ЧАЛАВЕКА Ў СУСЬВЕЦЕ

Кожны павінен займаць сваю нішу:
Машыну - Маша, а Мішаву - Міша.
Жора і Лора, Галя і Толя -
кожны сваю адыграць мусіць ролю.

Толькі ня блытайце нішы, бо можа
ў Грышу тады закахацца Сярожа.
Дзіма з Антонам і Таня са Сьветай
разам парушаць законы сусьвету…



www.kamunikat.org

**Вой, паглядзеце: Сёма і Гога**
**лаюцца матам адзін на аднога,**
**лупяць адзін аднаго і мяцеляць -**
**нішу, напэўна, ніяк не падзеляць.**

www.kamunikat.org

# ТРЫ ПЭДАЛІ ДЛЯ ГОНШЧЫКА



www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

* * *

Яна чытала Гумілёва.
Ён слухаў і казаў: “А клёва!”

## ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСЬНЯ РЭАЛІСТА

Як чытаем верш бяз рыфмы -
бы наскокваем на рыф мы.

Трохі менш у вершах ям бы!
Значна лепш - харэі, ямбы…

Калі вершы маюць рытмы -
адчуваем калярыт мы.

Ну а ў вершах новай формы
чуем бразгат аб фарфор мы.



www.kamunikat.org

* * *

- Чаму ты прамаўляеш хорам?
- Адному - сорам.

НЯ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА,
ШТО З ВОЗУ ЎПАЛА

- Чаму вада
не цячэ пад камень,
што на сэрцы тваім? -
пытаеце вы.
- Я чалавек
з залатымі рукамі,
толькі без галавы.



www.kamunikat.org

* * *

Я штатная Муза Саюзу пісьменьнікаў.
Назоўнікаў ведаю шмат і займеньнікаў.
Валодаю ўсімі памерамі й рымамі
І марамі масаў усімі магчымымі.

Я сэрцы мільёнаў ціхутка памацаю
І зь іх павыцягваю ўсю інфармацыю,
Каб гутарку весьці з народам карысную
Пра існае ў сьвеце або пра няіснае.



www.kamunikat.org

**Нарэшце, калі мы такія крутыя,
Навошта нам, Музам, пісьменьнікі тыя?
Мы можам што хочаш даволі прыстойна
Пісаць, друкаваць і чытаць самастойна!**



www.kamunikat.org

* * *

Здаваў ён кроў,
а я - мачу.
Ён дзіка роў,
а я - маўчу.



www.kamunikat.org

* * *

Скончым тыдзень за тры дні!
Скончым пятніцу за панядзелак!
І скочым у купальскія агні
Каля навагодніх елак!
Няхай потым ня будзе чаго чакаць
(Усё чаканае - зьдзейсьніцца),
Гэта ж так цікава - разглядаць час
З боку пачатку або канца!



www.kamunikat.org

## МІЛА МЫЛА МУЛА

Міла мела мала мыла.
Мыла мула мылам Міла.
Міла мула мыла міла.
Міла мыла мулу рыла –
мяла мулу рыла мылам.
Рыла мула нема ныла.



www.kamunikat.org

## БІЁЛЯГАМ-ПРАКТЫКАМ

Ня рэжце жабак, не катуйце мышак!
Яны не вінаватыя ні ў чым.
Зматайце лепш вантробіны з пакрышак
Машыны часу, на якой мы ймчым.



www.kamunikat.org

* * *

Праводзь сабе пальцам па аблоках,
Размазвай сабе неба па столі,
Той, хто ўсё спаталіў і ў спакоі,
А мы будзем таньчыць і скокаць.

Мы дзеці ненароджаных мамак,
Мы быйцы ненадыдзеных учора.
А ты назаўсёды падмануты
Зьменлівасьцю белых плямак.



www.kamunikat.org

* * *

Я цябе падманю,
я цябе падмману:
будзеш ты пада мной -
я цябе падамну.



www.kamunikat.org

* * *

Тры танкісты выйшлі з танку
І сьпяваюць калыханку:
Ціха-ціхенька ляжы,
Як памежнік на мяжы.
Не палохайся чужынцаў -
Гэта толькі муляжы.

МАНАВЕРШЫ



www.kamunikat.org

* * *

Даўно я ня бачыў суседа жывым!..

## ШЛЯХ ПАЭТА

Поўзаў По ў запоі.



www.kamunikat.org

* * *

Гніль дадала натхненьня пню.

## PERPETUUM MOBILE

Ужо пайду-пайду я...



www.kamunikat.org

* * *

Жыцьцё праходзіць, стоячы на месцы.

## ЗДРАДА

Ты здраджваеш мне зь іншымі кніжкамі!



www.kamunikat.org

* * *

А нехта пол мяняе, як пальчаткі…

АПАТЭОЗ ПУСТЭЧЫ

Засунь мяшкі ў мяшок зь мяшкамі!



www.kamunikat.org

* * *

**П’яўкі абступілі мяне.**

* * *

**Рэчаіснасьцю тут і ня пахне.**



www.kamunikat.org

# ВЕРШЫ НАШАГА СЯБРА ВАСІЛЯ ФІРХОЛЬДА



* * *

У мяне растуць гады.
Хутка я сканаю.
Кім зраблюся я тады?
Белым папугаем.



www.kamunikat.org

## МАРЖОВЫ СЬВЕТ

Мне не спасьцігнуць гэты сьвет
З крывавага нажа,
Мне не спазнаць жыцьця сакрэт,
Падобны да маржа.

Я ўсё жыцьцё мяшкі цягаў
І адарваў руку,
Бо Бог мне розуму ня даў
І кінуў у раку.



www.kamunikat.org

І я таксама ўсім багам
У горадзе Баку
Сябе такога ня аддам -
І амба мараку!



www.kamunikat.org

* * *

Першы ў сьвеце вершатворца -
невэрбальная прастора.
З гонарам, нібыта ў горца,
як пазбыцца мне ад гора?

Гэта ён лічыў сакрэтам -
паскідалі крылы коні.
Вось якім быў ён паэтам!..
Вось яны, на падваконьні!..



www.kamunikat.org

* * *

Дзьве нагі ў адну штаніну:
нешта ў лесе расквітнела!
Нарадзіць дачку ці сына?
Матавіла - з "Мотавела".

А назаўтра прыйдзе стома:
дзе схаваная руда ўся?
Дзе ты, з кім ты - невядома,
каб ніхто не здагадаўся...



www.kamunikat.org

* * *

Могілкі. Цёмна. Крыжы. Камяні.
Ствол ён наводзіў і ў сэрца цаляў.
Нехта праехаў на белым кані -
зноў зараджаў і са злосьцю страляў.

Лёгка працуе рыдлёўка ў зямлі,
вось і застаўся апошні патрон.
Гэта па небе прайшлі караблі…
Цяжка заўсёды ўздымацца на трон!



www.kamunikat.org

* * *

Ні цыгарэт, ні наркаты…
Туман сьцяліўся па зямлі,
а за вакном раўлі каты.
І я сказаў: “Ну вось, прыйшлі”.

Няма каго цягнуць за хвост,
таму гуляла ўсё сяло,
таму за гэта - першы тост.
Але мяне там не было!



www.kamunikat.org

* * *

Гэты горад, марудны, як трактар,
гераічна вісеў на бярозе.
Праляталі талеркі над трактам,
хоць сказаць гэта лепей бы ў прозе.

“Прывітаньне! - крычалі нам зоры, -
Не патрэбны ні оды, ні гімны”.
Па якімсьці касьмічным узоры
ты - мураш, а сусьвет - неабдымны.



www.kamunikat.org

* * *

Мне кахаць бы вас, дзяўчаты,
па гары вясёла бегчы!
Мой паход да вас пачаты -
я кручуся, нібы ў сьмерчы!

З вэнэрычнаю хваробай
несьціся, дзе носяць чэрці,
каб размотвала вантробы!..
І спыніцца. І памерці.



www.kamunikat.org

* * *

Расталі ў зімовай лядоўні
на гэтай вясёлай плянэце
маленькія промні-далоні:
катаўся бландын на брунэце.

І плавіцца тоўстая корка,
гайдаюцца доўгія ногі
і хутка зьбягаюць з пагорка.
Ніхто не саступіць дарогі…



www.kamunikat.org

* * *

Чатыры маленькія рыбкі
Срабрыста-сьцюдзёнай зімою
Ля помніка Янкі Купалы
З палеглым у бітве героем
Гулялі ў футбол на траве,
Каб памяць людзкая ня згасла,
А іх распранулі прылюдна,
На булку намазалі масла.



www.kamunikat.org

## Зьмест

Маніхвэст (В. Ж.) ....................3

КУШЭТКА-ГРЫЛЬ

“На правадох электрык павіс...” (В. Ж.) ....................6
Шахцёрам (В. Ж.) ....................7
“Няма вушэй у птушак...” (В. Б.) ....................8
Лагодны травень (В. Б.) ....................9

“Феі, эльфы і русалкі...” (В. Б.) ..............................10
“На чырвонае сьвятло…” (В. Ж.) ..............................11
“Прыгажуня йшла ўміраць...” (В. Б.) ..........................12
“Я працягнуў руку дапамогі...” (В. Ж.) ......................14
“Трамвай спыніўся на павароце...” (В. Б.) ...................14
“Бэзавыя джунглі…” (В. Б.) ....................................15
Цяжкі выпадак (В. Ж.) ..........................................15
Трыялет (В. Б.) ..................................................16
“Выйшаў чалавек глухі...” (В. Б.) .............................17

“Учора ці пазаўчора...” (В. Ж.) ..............................17
“Запусьцілі мы ракету...” (В. Ж.) ...........................18
Кім быць? (В. Б.) ..................................................18
Летапіснае (В. Б.) .................................................19
“Недастварыўшы перла...” (В. Б.) ............................20

КАПІТАН ЖУЕ

Вожыкі (В. Ж.) ........................................................23
Спрэчка (В. Б.) ........................................................24



www.kamunikat.org

“У мяне зачасалася сьпіна...” (В. Ж.) ........................26
Праляталі птушкі (В. Б.) .........................................27
Эрдэльтэр’ер (В. Ж.) ...............................................28
“Сьвет – тэатар. Людзі ў сьвеце…” (В. Б.) ..................29
Чаплеласі (В. Ж.) ......................................................30
“Маё сэрца стракоча, як швальная машынка…” (В. Б.) ..31
Чаму я вэгетарыянец (В. Ж.) .....................................31
Трыялет-брахікалян (В. Б.) ........................................32
Туюг багемны (В. Ж.) ...............................................33



www.kamunikat.org

Туюг застольны (В. Ж.) ....................................33
Туюг экалягічны (В. Ж.) ..................................34
“Лыжнік сеў за піяніна…” (В. Б.) ..........................35
“Хаты бяз птахаў...” (В. Ж.) ..............................35
На ложку (В. Б.) ..........................................36

КЛЮБ АМАТАРАЎ АДЗІНОТЫ

Любі (В. Б.) ..............................................39
Плягіят (В. Б.) ...........................................40

“Дзеўка купіла вяроўку і мыла...” (В. Б.) ..................41
Элегія № 1 (В. Б.) ..............................................41
“Яны ад’язджалі па альфабэце…” (В. Б.) ...................42
“Мой голас лунае ў прыгожай магільні…” (В. Б.) .........43
“Яна ведала, чым усё скончыцца…” (В. Б.) .................44
“Навошта мне маё жыцьцё бяз Слова…” (В. Б.) ...........46
“Калі было мне тры гады...” (В. Ж.) ..........................46
На мастацкай выставе (В. Ж.) ..................................47
“на дне...” (В. Ж.) ..................................................47



www.kamunikat.org

“Ёсьць людзі блізкія...” (В. Ж.) ..............................48
“У цяжкім змаганьні зь лянотай…” (В. Ж.) ................48
“Думаў: зараз прыляціць натхненьне...” (В. Ж.) .........49
“Рэчаіснасьць мне заткнула рот...” (В. Ж.) ...............50
Аб месцы чалавека ў Сусьвеце (В. Ж.) ......................51

ТРЫ ПЭДАЛІ ДЛЯ ГОНШЧЫКА

“Яна чытала Гумілёва…” (В. Б.) ...........................55
Лебядзіная песьня рэаліста (В. Ж.) ..........................56

"- Чаму ты прамаўляеш хорам?.." (В. Б.) ..................57
Ня ўсё тое золата, што з возу ўпала (В. Ж.) ...............57
"Я штатная Муза Саюзу пісьменьнікаў…" (В. Б.) ..........58
Здаваў ён кроў..." (В. Ж.) ........................................60
"Скончым тыдзень за тры дні…" (В. Б.) .......................61
Міла мыла мула (В. Ж.) ..............................................62
Біёлягам-практыкам (В. Б.) ........................................63
"Праводзь сабе пальцам па аблоках…" (В. Б.) ............64
"Я цябе падманю..." (В. Б.) .........................................65

“Тры танкісты выйшлі з танку…” (В. Б.) ....................66

МАНАВЕРШЫ

“Даўно я ня бачыў суседа жывым...” (В. Ж.) .............68
Шлях паэта (В. Б.) ..............................................68
“Гніль дадала натхненьня пню...” (В. Ж.) ..................69
Perpetuum mobile (В. Б.) .......................................69
“Жыцьцё праходзіць, стоячы на месцы...” (В. Ж.) ......70
Здрада (В. Б.) ......................................................70



www.kamunikat.org

“А нехта пол мяняе, як пальчаткі...” (В. Ж.) ..............71
Апатэоз пустэчы (В. Б.) ......................................71
“П’яўкі абступілі мяне…” (В. Б.) ...........................72
“Рэчаіснасьцю тут і ня пахне...” (В. Ж.) ..................72

ВЕРШЫ НАШАГА СЯБРА ВАСІЛЯ ФІРХОЛЬДА

“У мяне растуць гады…” (В. Ф.) ..............................74
Маржовы сьвет (В. Ф.) ..........................................75



www.kamunikat.org

“Першы ў сьвеце вершатворца…” (В. Ф.) ..................77
“Дзьве нагі ў адну штаніну…” (В. Ф.) .......................78
“Могілкі. Цёмна. Крыжы. Камяні…” (В. Ф.) ...............79
“Ні цыгарэт, ні наркаты…” (В. Ф.) ..........................80
“Гэты горад, марудны, як трактар…” (В. Ф.) .............81
“Мне кахаць бы вас, дзяўчаты…” (В. Ф.) ...................82
“Расталі ў зімовай лядоўні…” (В. Ф.) .......................83
“Чатыры маленькія рыбкі...” (В. Ф.) ........................84

Зьмест (В. Ф.) .....................................................85

Літаратурна-мастацкае выданне
Другі фронт мастацтваў

**БУРЛАК** Вера Юр’еўна, **ЖЫБУЛЬ** Віктар Вячаслававіч
ЗАБІ Ў САБЕ САКРАТА!
Вершы

Рэдактар Зміцер Вішнёў; Дызайн вокладкі Сяргей Ждановіч; Карэктар Віка Трэнас; Адказны за выпуск Уладзімір Гніламёдаў
На вокладцы выкарыстана графіка Ігара Клімава

Падпісана да друку 11.04.2008. Фармат
Папера афсетная. Гарнітура “Trebuchet”. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. Ул.-выд. арк. Наклад 300 асоб. Замова

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства “Галіяфы”
ЛИ № 02330/0150300 ад 08.04.2008 г.
220039, г. Мінск, вул. Брылеўская, 11-44.
E-mail: vish@bk.ru www.goliafy.com

Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю “Медысонт”.
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.2004 г.
220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9